лям психолого-педагогическую помощь в осуществлении семейного воспитания) компетенций.

Таким образом, рассматривая проблему подготовки учителя начальных классов к взаимодействию с семьей учащегося с позиции компетентностного подхода, можно заключить, что одной из составляющих, оказывающих непосредственное влияние на повышение профессиональной компетентности педагога, является организованная методическая работа в учреждении образования, направленная на формирование готовности педагогов к реализации новых целей, задач и содержания процесса взаимодействия с семьей посредством проведения методических семинаров и стимулирующая развитие творческой активности педагогов и готовности к самореализации.

**Список литературы**


1. Василевич, О. П. Готовность к профессиональному саморазвитию как ключевая компетенция начинающего преподавателя высшей школы / О. П. Василевич // Адукацыя і выхаванне. – 2015. – № 1. – С. 41–45.
2. Кухарев, Н. В. Профессиональная компетентность педагога как объект исследования, прогнозирования и обоснования: акмеологическая доминанта / Н. В. Кухарев // Адукацыя і выхаванне. – 2015. – № 6. – С. 54–61.


---

# САМААНАЛІЗ І САМАКАНТРОЛЬ ЯК СКЛАДНІКІ РЭФЛЕКСІЎНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ БУДУЧЫХ НАСТАЎНІКАЎ ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАЎ


*Калпінская Н.С.,*
*Лідскі каледж УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы», г. Ліда*



Анатацыя. Дадзены артыкул прысвечаны пытанню развіцця здольнасці будучых настаўнікаў пачатковых класаў да самааналізу і самакантролю вучэбнай дзейнасці як рэгулятараў іх асобасных дасягненняў, а таксама пабуджальнікаў прафесійнага росту і асабістага ўдасканалення. Разглядаюцца асаблівасці працэсу стварэння ўмоў, якія забяспечаць «запуск» механізму самаактуалізацыі, а таксама будуць садзейнічаць набыццю навучэнцамі вопыту самастойнай дзейнасці і асабістай адказнасці, паспрыяюць павышэнню іх культуры разумовай працы. Апісваюцца ўзроўні развіцця механізму самакантролю, формы навучання, віды заданняў па фарміраванні ўменняў самакантролю і самаацэнкі.



*Ключавыя словы: самааналіз і самакантроль, рэфлексіўныя кампетэнцыі, самарэалізацыя, саманазіранне, самакарэкцыя.*


У сённяшні час адукацыя ўсё больш арыентуецца на сцвярджэнне асобаснага актыўнага пачатка ў чалавеку. Усё шырэй уводзяцца паняцці «ўніверсальныя (метапрадметныя) ўменні», «універсальныя навучальныя дзеянні». Пры падрыхтоўцы будучых настаўнікаў пачатковых класаў на першы план выходзіць забяспечэнне іх паўнавартаснага асобаснага, сацыяльнага

і культурнага развіцця, фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці. Падрыхтоўка да ажыццяўлення прафесійнай педагагічнай дзейнасці мяркуе і фарміраванне ўменняў самастойна ацэньваць сябе, праводзіць аналіз дзейнасці іншых, самааналіз, прымаць рашэнні, ставіць разумныя рэальныя мэты, вызначаць змест сваёй дзейнасці, знаходзіць спосабы яе рэалізацыі, здзяйсняць дзеянні і кантраляваць іх, гэта значыць дэманстраваць асабістыя кампетэнтныя паводзіны. Вышэйпералічаныя кампетэнцыі накіраваны на фарміраванне педагога новага тыпу, здольнага да далейшага самаразвіцця і самаадукацыі ў прафесійным і ў асобасных планах.

Рэгулятарам асобасных дасягненняў настаўнікаў, пабуджальнікам да прафесійнага росту і ўдасканалення педагагічнага майтэрства выступаюць рэфлексіўныя кампетэнцыі. Яны дазваляюць асэнсоўваць свае цяжкасці, знаходзіць спосабы работы з імі, стымулююць даследчы, творчы працэс і ў далейшым стануць тым «выратавальным кругам», які дазволіць настаўніку перавесці сітуацыю з праблемнай у задачу матываванай, асэнсаванай і прафесійнай дзейнасці.

Важнымі этапамі рэфлексіі з’яўляюцца самакантроль і самаацэнка. У псіхолага-педагагічнай літаратуры самаацэнка разглядаецца як выніковы кампанент самакантролю. Самакантроль ажыццяўляецца пры наяўнасці эталона, таго, што павінна быць у ідэале. Пры самаацэнцы адбываецца параўнанне выкананай работы з эталонам, правяраецца правільнасць і якасць работы, выстаўляецца адзнака.

Выкладчыку неабходна па сродках вучэбнай дысцыпліны як агульнаадукацыйнага, так і прафесійнага кампаненту стварыць ўмовы для развіцця ў навучэнца ўмення самастойна ацэньваць сваю працу, фіксаваць яе вынікі, планаваць спосабы і метады для дасягнення пастаўленых задач, навучыць кантраляваць сваю дзейнасць і даваць ёй ацэнку. Пры арганізацыі работы на ўроку ў навучэнца павінна скласціся дакладнае ўяўленне пра тое, што трэба ацэньваць, як ацэньваць, навошта ацэньваць і якія формы ацэнак існуюць. З цягам часу гэта стане сваеасаблівым планам дзеяння і дапаможа ім дзейнічаць лагічна, у адпаведнасці з правіламі паводзін.

У псіхолага-педагагічнай літаратуры вылучаюць папярэдні, працэсуальны і выніковы кантроль, а таксама дзве формы самакантролю: знешнюю (асэнсаваную), унутраную (аўтаматычную) [5]. Граматнае педагагічнае ацэньванне павінна накіроўваць развіццё навучэнцаў ад знешняй ацэнкі да самаацэнкі, спалучаць кампетэнтнаснае ацэньванне іншых з самаацэнкай педагога. У аснове самакантролю ляжыць прынцып асэнсаванага працэсу навучання. «Што я даведаўся новага, якія спосабы дзейнасці засвоіў, як змяніліся мае ўяўленні пра свет, як змяняюся я сам у працэсе навучання, што мне лепш запомнілася, засвоілася, чаму не атрымлівалася?» Гэты пры-

нцып накіроўвае працэс навучання на асэнсаванне навучэнцам сябе як суб'екту вучэбнай дзейнасці. У псіхалогіі добра вядомы эфект вывучанай бездапаможнасці. Ён узнікае ў раскладзе жыцця, які строга кантралюецца, у тым ліку і ва ўмовах манаполіі прадметна-арыентаванай мадэлі навучання, якую засвоіла традыцыйная школа. Пры такім навучанні дзіця, з'яўляючыся аб'ектам кіравання з боку выкладчыка, паступова прывыкае да таго, што ацэнка і карэкціроўка яго дзейнасці знаходзіцца не ў яго руках, а з'яўляецца выключна прэрагатывай педагогаў. Такім чынам, парушаецца права любога чалавека на памылку і яе выпраўленне, а значыць, права на інтэлектуальную ўласнасць, на паўнавартасную дзейнасць, у выніку прападае патрэба і ў кантролі над сітуацыяй, так як кантроль пастаянна знаходзіцца ў руках дарослых, у навучэнцаў губляецца пачуццё асабістай годнасці, вера ў сябе [3].

Унутраны самакантроль фарміруецца доўгі час. Падчас вучобы ў сярэдніх спецыяльных установах адукацыі магчыма фарміраванне толькі некаторых яго элементаў. Вядома, механізм самакантролю можа фарміравацца стыхійна. Псіхалагічна больш апраўдана зрабіць гэты працэс мэтанакіраваным. Можна вылучыць чатыры ўзроўні развіцця механізму самакантролю:

– нармальна развіты механізм самакантролю – навучэнец карэктна ажыццяўляе вучэбныя дзеянні, досыць хутка здабывае з памяці веды, якія патрабуюцца ў той ці іншай сітуацыі і ўсведамляе гэта;

– у цэлым сфарміраваны механізм самакантролю – навучэнец здзяйсняе некаторыя навучальныя дзеянні памылкова, усведамляе гэта і ўносіць карэктывы;

– механізм самакантролю не даведзены да дасканаласці – самакантроль змяняе сваю форму з унутранай на знешнюю пасля здзяйснення памылковага дзеяння;

– механізм самакантролю не сфарміраваны – навучэнец здзяйсняе памылковыя дзеянні, не можа ўспомніць патрэбную інфармацыю і не асэнсоўвае гэтага.

У ходзе вучэбнай дзейнасці мяркуецца, што навучэнец навучыцца: разумець і прымаць кантроль выкладчыка; назіраць і аналізаваць вучэбную дзейнасць сваіх аднагрупнікаў; ажыццяўляць назіранне за сваёй вучэбнай дзейнасцю, рабіць яе самааналіз, ацэньваць вынікі асабістай дзейнасці па ўзгодненых крытэрыях і карэкціраваць дзеянні. Якую б дзейнасць навучэнцы не ажыццяўлялі, яны павінны мець псіхалагічна поўную структуру – ад разумення і пастаноўкі мэтаў і задач праз выкананне дзеянняў, прыёмаў, спосабаў і да ажыццяўлення дзеянняў самакантролю і самаацэнкі [4].

Любое навучанне – арганічнае адзінства двух працэсаў: перадачы навучэнцу ў той ці іншай форме вучэбнага матэрыялу і выяўленне ступені засваення гэтага матэрыялу (кантроль вынікаў навучання). Для таго, каб навучэ-

нец разумеў і прымаў кантроль выкладчыка мэтазгодна пазнаёміць іх з нормамі і крытэрыямі ацэнкі ведаў, уменняў і навыкаў; паведаміць, на якім этапе вывучэння матэрыялу неабходны кантроль і з якой мэтай; прадаставіць магчымасць навучэнцам самастойна ацаніць сваю дзейнасць і растлумачыць атрыманую імі адзнаку, зыходзячы з крытэрыяў ацэнкі; прадаставіць магчымасць навучэнцу ацаніць дзейнасць аднагрупніка, абапіраючыся на названыя выкладчыкам крытэрыі; навучыць карыстацца рознымі відамі праверкі.

У рамках урока адкрываецца перспектыва выкарыстання разнастайных метадаў, прыёмаў, тэхналогій, якія дапамогуць навучэнцам у набыцці вопыту самастойнай дзейнасці і асабістай адказнасці. Самарэалізацыя навучэнца магчыма толькі ў ходзе асабістай дзейнасці, якая прыносіць рэальныя адукацыйныя прадукты, асобасна значымыя не толькі для навучэнца, але і для іншых. Важна, што ў ходзе руху па індывідуальнай траекторыі навучэнец вучыцца ствараць і стварае прадукцыю знешнюю, матэрыялізаваную, і унутраную, асобасную, вучыцца планаваць дзейнасць на дасягненне мэты, кантраляваць і ацэньваць кожны этап дзейнасці, уносіць карэктывы. Адным з дзейнасных сродкаў пачатку дзеяння з'яўляецца прадстаўленне навучэнцам рэальных аб'ектаў вучэння – тых, якія іх акружаюць. Дзейнасць складаецца з дзеянняў, а тыя з аперацый. Для таго, каб прадыягнаставаць уменні навучэнца выконваць асобныя дзеянні, іх неабходна вычляніць з яго дзейнасці. Дыягнаставацца і ацэньвацца можа кожны элемент адукацыйных вынікаў навучэнца і якасць самога адукацыйнага прадукта [2].

Прывядзем прыклад падыходу для дыягностыкі і ацэнкі такога выніку навучання як яго ўменне паставіць мэту творчай работы. Гэтыя ўменні ўключаюць у сябе наступныя элементы-дзеянні навучэнца:

– прадбачанне ў сваёй мэце выніку;

– уключэнне ў мэту свайго прагназуемага прадукту;

– вербальная фармуліроўка мэты – вызначэнне яе складу;

– уключэнне ў фармуліроўку мэты яе кампанентаў – прадмета дзейнасці, віду дзейнасці, тэрміна дзейнасці, умоў яе дасягнення;

– улік правяраемасці дясягнення мэты ў яе фармуліроўцы;

– прывядзенне фармуліроўкі мэты ў адпаведнасці з перыядам яе дасягнення;

– карэкціроўка фармуліроўкі мэты для адэкватнага яе ўспрыняцця іншымі.

Пералічаныя элементы-дзеянні, па сутнасці, выступаюць крытэрыямі ацэнкі ўсяго дасягнутага навучэнцамі выніку: пастаўленай ім мэты. Форма ацэнкі кожнага пералічанага элемента-дзеяння можа быць як колькасная (залік-незалік, 10-бальная і г. д.), так і якасная – у выглядзе апісання, пераліку характарыстык. Так, напрыклад, для таго, каб навучэнец дакладна ўяўляў сабе, што і як ён вывучае сёння, на наступным занятку і якім чынам ён

зможа выкарыстаць атрыманыя веды ў далейшым жыцці, перад арганізацыяй работы над тэмай урока выкладчык (або навучэнец) расказвае аб ёй, а навучэнцы фармулююць па гэтай тэме пытанні, якія пачынаюцца са слоў: «навошта», «чаму», «як», «чым», «аб чым» або прымяняецца метад «6 Н». Далей сумесна з навучэнцамі ацэньваецца самае цікавае, пры гэтым трэба імкнуцца да таго, каб не адно пытанне не засталося без адказу [1].

Для фарміравання мэты ўрока добра падыходзяць метады «Ведаю. Хачу даведацца. Даведаўся», складанне плану па вывучаемай тэме і вызначэнне крокаў па яго рэалізацыі, вызначэнне ключавой праблемы і г. д.

Разам з тым, на першы план на этапе фармуліроўкі мэты ўрока выходзіць інфарміраванне аб абавязковых выніках навучання, прад'яўленне вучэбных патрабаванняў, свабодны выбар заданняў, заахвочванне, апора на жыццёвы вопыт і прагноз на будучае, самаацэнка дзейнасці і карэкцыя, рэфлексія паводзін. У працэсе вучэння неабходна прадаставіць магчымасць навучэнцу ажыццяўляць назіранне за сваёй вучэбнай дзейнасцю, рабіць яе самааналіз, ацэньваць свае дзеянні і карэкціраваць іх. Для забяспячэння асэнсаванага засваення навучэнцамі вучэбнага матэрыялу, разумення імі лагічных сувязей паміж элементамі вучэбнага матэрыялу, прычынна-выніковых сувязей паміж фактамі мэтазгодна арганізаваць актуалізацыю раней засвоеных ведаў па сродках складання плану адказу на пытанне, апорнага канспекта, фармальна-лагічнай мадэлі – славесна-схематычнай выявы прачытанага ў выглядзе табліц, іерархічных схем, лагічных схем («ланцужкоў»), кластара. Таксама вельмі эфектыўна выкарыстанне метадаў «Мазгавы штурм», выкананне дыягнастычнага тэставага задання, бліц-апытванне, аналітычная гутарка, верш-загадка, праграмаваны кантроль, тлумачальны дыктант «Правяраю сябе». На першы план выходзіць метад алгарытмізацыі (распрацоўка алгарытмаў, сукупнасці правіл, якія вызначаюць паслядоўнасць рашэння граматычных задач) і выкананне адпаведных вучэбных дзеянняў, якія падводзяць да вываду. Перш чым карыстацца алгарытмам, выкладчык паказвае ўзор правільнага ходу думак і сумесна з навучэнцамі складае схему паслядоўнасці лагічных аперацый. Як толькі навучэнцы запомнілі паслядоўнаць лагічных дзеянняў і навучыліся самастойна выконваць іх, выкладчык дае магчымасць навучэнцам самастойна выконваць практыкаванні і праверыць сябе па адказах. Добры эфект дае выкарыстанне тэхналогіі працэсуальнага маніторынгу, эўрыстычных сітуацый (праблемна-пошукавых, асацыятыўных, рэфлексіўных), выкананне заданняў з «лішнімі дадзенымі», з карткай дзейнасці навучэнца (указаны этап работы, нумар тэксту або від задання, вынікі дзейнасці, самаацэнка), самастойны аналіз, шматаспектны (комплексны) лінгвістычны аналіз. Для развіцця ў навучэнцаў навыкаў самакантролю ў працэсе пісьма, эфектыўным відам з'яўляецца тлумачальны дыктант «Правяраю сябе» (па методыцы А.І.Кобызева). Мето-

дыка яго правядзення заключаецца ў тым, што выкладчык дыктуе, а навучэнцы пішуць, але калі пры гэтым сумняваюцца ў напісанні, прапускаюць месца, на палях пішуць знак ?, каб потым запытацца, як правільна напісаць, а затым пішуць, падкрэсліваюць пэўную арфаграму (для таго, каб выкладчыку прасачыць, ці дапускае навучэнец памылак у аналагічных выпадках). На пытанні навучэнцаў адказвае выкладчык ці больш падрыхтаваны навучэнец. Пытанні заахвочваюцца і не ўплываюць на ацэнку дыктанта, аднак яны не павінны паўтарацца [1].

У выніку сістэмнай работы выкладчыка ў навучэнцаў фарміруецца ўменне суадносіць прыкладзеныя намаганні з атрыманымі вынікамі вучэбнай дзейнасці, а таксама ўменне аб'ектыўна ацэньваць свае вучэбныя дасягненні.

Назіраць і аналізаваць вучэбную дзейнасць сваіх аднагрупнікаў дапамагае ўзаемаправерка самастойных дамашніх работ; прадстаўленне свабоды выбару (форм кантролю, відаў заданняў), а таксама максімальнае зняцце знешняга кантролю. Прадуктыўнымі становяцца такія формы кантролю, як самакантроль, узаемакантроль «навучэнец – навучэнец», самаацэнка дзейнасці; аналіз асобных разгорнутых адказаў навучэнцаў за наступным іх аналізам; рэцэнзаванне. На аснове вынікаў ажыццяўляецца карэкцыя дзейнасці, прагназаванне будучай дзейнасці, плануецца самастойная работа, навучэнцы пабуджаюцца да пошуку альтэрнатыўных рашэнняў, вучацца ўлічваць думку аднагрупнікаў, пры наяўнасці асабістай пазіцыі і самаацэнкі.

У працэсе ўзаемаправеркі навучэнцы звяраюць адказы, шукаюць памылкі, тлумачаць іх адзін аднаму. Атрыманыя навыкі кантролю навучэнец пераносіць на сваю дзейнасць (самакантроль). Практыка паказвае, што на этапе фарміравання ўмення назірання і аналізу вучэбнай дзейнасці сваіх аднагрупнікаў таксама важна прапаноўваць навучэнцам ацаніць адказ аднагрупніка, задаць яму пытанні, зрабіць заўвагі па сутнасці адказу, выказаць свае меркаванні адносна атрыманага выніку, ідэі і ходу рашэння, а таксама паспрабаваць прапанаваць іншы варыянт адказу або рашэння.

Для фарміравання і развіцця ў навучэнца навыка ажыццяўляць саманазіранне, самааналіз і самакарэкцыю сваёй дзейнасці на вучэбным занятку выкарыстоўваюцца розныя метады і віды заданняў. Так, пры выкананні дамашняга задання можна правяраць ступень засваення матэрыялу шляхам складання плана прачытанага ці пераказу галоўных думак, адказваць на кантрольныя пытанні падручніка, складаць дадатковыя кантрольныя пытанні да матэрыялу, які вывучаецца, знаходзяць адказы на пытанні ў падручніку, супастаўляць новую інфармацыю з раней вывучанай. У выніку ў навучэнцаў фарміруецца звычка аналізаваць атрыманыя вынікі, правяраць правільнасць выканання заданняў. Пры выяўленні ў навучэнца памылкі ў самаацэнцы трэба разам з вучнем разгледзець, чаму ён сабе паставіў гэтую,

а не іншую адзнаку, і дапамагчы разабрацца ў нормах ацэнкі, каб навучэнец мог правільна карыстацца імі ў далейшым.

Для рэалізацыі элементаў «сама» добры эфект дае прымяненне такіх метадаў і прыёмаў, як самаацэнка дзейнасці і карэкцыя, рэфлексія паводзін, стварэнне сітуацыі ўзаемадапамогі, пошук кантактаў і супрацоўніцтва, самаправерка. Для рэалізацыі элементаў «сама» мэтазгодна фарміраваць у навучэнцаў уменне кантраляваць сваю дзейнасць непасрэдна ў ходзе заняткаў, выкананні практыкаванняў; прымяняць заданні рознай складанасці. Для гэтага неабходна прапаноўваць навучэнцам спецыяльныя заданні, у якіх трэба знайсці дапушчаныя памылкі і недакладнасці. Пры рабоце важна кіравацца прынцыпамі пасільнасці і даступнасці. Спачатку варта даваць устаноўку на кантроль аднаго з аспектаў дзейнасці, затым ўскладняць задачу ўключэннем у кантроль двух і больш аспектаў і накіраваць кантроль навучэнца на ўтрыманне канчатковага прадукту яго дзейнасці. Навучэнец карэкціруе сваю дзейнасць і вучыцца задаваць сабе пытанне: «Што мне трэба зрабіць, каб павысіць свой узровень?»

Прыведзеныя вышэй метады, прыёмы і тэхналогіі з'яўляюцца метапрадметнымі і могуць быць выкарыстаны на вучэбных занятках у рамках любой вучэбнай дысцыпліны. Надаваць увагу развіццю самааналізу і самакантролю будучых настаўнікаў пачатковых класаў неабходна ва ўсіх аспектах адукацыйнага працэсу.

Задача выкладчыка ўлічваць узровень навучэнца, навучыць яго навыкам адэкватнай ацэнкі сваёй вучэбнай дзейнасці і правільнаму стаўленню да ўласных поспехаў і няўдач. Вялікае значэнне ў гэтым плане мае фарміраванне правільнага стаўлення навучэнцаў да сваіх памылак. Варта змяніць існае стаўленне да памылкі як да чагосьці недапушчальнага. Навучэнец павінен засвоіць, што памылкі непазбежныя падчас нармальнай пазнавальнай дзейнасці і могуць дапамагчы глыбей зразумець матэрыял, які вывучаецца. Неабходна прывучаць навучэнцаў пастаянна задаваць сабе пытанне: «Чаму так?», «Што патрабуецца?», «Як гэта робяць іншыя?», «Як гэта рабілі на ўроку?», «Якія ёсць рэкамендацыі па гэтым пытанні?» Па магчымасці трэба звесці да мінімуму негатыўныя ацэнкі дзейнасці навучэнцаў, а звяртаць асаблівую ўвагу на якасны аналіз.

Падчас самааналізу навучэнцам неабходна звярнуцца да сумеснай індывідуальнай дзейнасці, расказаць пра цяжкасці, якія ўзніклі падчас вырашэння праблемы, выявіць прычыны сваіх памылак, не толькі па змесце, але, што асабліва важна, па спосабу зносін, вызначыць шляхі іх выпраўлення. Тым самым навучэнец уводзіцца ў новую вучэбную праблему – праблему асэнсавання сродкаў, індывідуальнай і сумеснай разумовай дзейнасці. Дзякуючы самааналізу і самакантролю, навучэнец ідзе да асэнсавання сваіх канкрэтных спосабаў дзейнасці, да сістэматызацыі, іх абагульнення, адмовы ад памылковых прыёмаў і падыходаў, што ў выніку развівае яго як асобу.

Практыка паказвае, што работа па фарміраванні кіраўнічай і рэфлексіўнай кампетэнцыі будучых настаўнікаў пачатковых класаў не толькі дапамагае мабілізаваць іх дзейнасць, станоўча ўплывае на развіццё інтэлекту, павышае культуру разумовай працы, але і дае вопыт самастойнай дзейнасці і асабістай адказнасці, а таксама магчымасць індывідуалізаваць працэс навучання.

**Спіс літаратуры**


1. Выкладанне беларускай мовы ў школе / М. Г. Яленскі [і інш.] ; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск : Народная асвета, 1994. – 239 с.
2. Калпінская, Н. С. Рэалізацыя прынцыпу чалавекаадпаведнай адукацыі на ўроках беларускай мовы як фактар фарміравання ўнутранай матывацыі навучэнцаў / Н. С. Калпінская // Мастерство online [Электронный ресурс]. – 2017. – № 1(10). – Рэжым доступу: http://ripo.unibel.by /index.php?id=2717. – Дата доступу: 26.09.2018.
3. Левитес, Д. Г. Школа для профессионалов, или Семь уроков для тех, кто учит / Д. Г. Левитес. – М. : Московский психолого-социальный институт; Воронеж : Изд-во НПО «МОД ЭК», 2001. – 256 с.
4. Локалова, Н. П. Школьная неуспеваемость: причины, психокоррекция, психопрофилактика / Н. П. Локалова. – СПб. : Питер, 2009. – 368 с.
5. Памятка для учителей об этапе самоанализа и самооценки [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://janovkasosh.schools.by/pages/uchiteljam-predmetnikam. – Дата доступа: 26.10.2018.


---

# ФОРМИРОВАНИЕ ПРОФЕССИОНАЛЬНЫХ КОМПЕТЕНЦИЙ БУДУЩИХ УЧИТЕЛЕЙ НАЧАЛЬНЫХ КЛАССОВ В ПРОЦЕССЕ САМОСТОЯТЕЛЬНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ


*Митрохина С.В., доктор педагогических наук, доцент*
*ФГБОУ ВО «Тульский государственный педагогический университет им. Л.Н. Толстого», г. Тула*



Аннотация. В статье рассматривается проблема формирования профессиональных компетенций у студентов в процессе их самостоятельной деятельности. Выделены ключевые компетенции, характеризующие профессиональную деятельность педагога. Представлены этапы развития самостоятельной деятельности. Приведены примеры заданий разного уровня сложности для разных этапов развития самостоятельной деятельности и направленные на формирование профессиональных компетенций будущих учителей начальных классов.



*Ключевые слова: студент, профессиональные компетенции, самостоятельная деятельность, будущий учитель начальных классов, задания для самостоятельной работы*


Перемены, происходящие в современном обществе, затрагивают и сферу образования. Это находит свое отражение в новых Федеральных государственных образовательных стандартах высшего образования, в которых речь идет о построении личностно ориентированного образовательного пространства на основе системно-деятельностного подхода. В этом же до-